Шыфр:______________________

Колькасць балаў:_______________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта, намеснік Міністра адукацыі

_____________ Р.С. Сідарэнка

«17» _______________ 2017 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Гомель, 2017 г.*

**9 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Варыянт I**

**Заданне 1.** З прапанаваных ніжэй гукаў (гукавых спалучэнняў) выберыце тыя, што, у адпаведнасці з правіламі літаратурнага вымаўлення, павінны вымаўляцца ў прыведзеных у табліцы словах у месцах пропуску. Нумары выбраных гукаў (гукавых спалучэнняў) упішыце ў табліцу насупраць адпаведных ім слоў.

Гукі і гукавыя спалучэнні:

1 – [*і*],
2 – [*ы*],
3 – [*й*],
4 – [*йі*],
5 – [*ый*].

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожнае правільнае рашэнне).

| | | | |
|---|---|---|---|
| *без[ ]менны* | | *пр[ ]шоў* | |
| *пра[ ]граць* | | *між[ ]нстытуцкі* | |
| *за[ ]кацца* | | *ад[ ]сці* | |
| *ад[ ]граць* | | *пера[ ]начыць* | |

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай форме, складзіце пяць фразеалагізмаў з кампанентам ***нага***, запісаўшы іх у правым слупку табліцы насупраць адпаведных для ўстойлівых выразаў значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў:

*адчуваць, гарэць, глеба, зямля, кароткі, левы, на, на, не, пад, пад, смаркацца, шырокі.*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | 'хто-небудзь у небяспечным, пагрозлівым становішчы' | |
| 2. | 'мець цвёрдую ўпэўненасць у сабе' | |
| 3. | 'у блізкіх, сяброўскіх адносінах' | |
| 4. | 'багата, раскошна, без абмежаванняў у сродках (жыць, пажыць, пражыць)' | |
| 5. | 'разбірацца ў чым-небудзь не горш за іншых, быць не пазбаўленым здольнасцей, ведаў і пад.' | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Над прудом быстро светлело. По воде побежала тёмная тень и спряталась под прибрежные кусты. И вдруг сверху хлынул весёлый золотой свет: солнце встало над елями. Кусочек чистой воды у берега осветился, и стало видно, чья это круглая головка: там пряталась водяная лилия. Лилия медленно поднималась из воды на длинной, гибкой, зелёной ножке. Когда вся головка вышла на воздух, лепестки, закрывавшие её, стали раскрываться, раскрываться… *(По В. В. Бианки).*

Зямны паклон табе, пясняр,
К табе ішоў я дні і ночы.
З таго я залатога дня,
Які народу ты прарочыў.

З таго я светлага кутка,
Дзе ткуць на волі, без прынукі
Дзяўчат упэўненыя рукі
Цвяток радзімы васілька.

1. Каму прысвечаны гэты верш? Абгрунтуйце сваю думку.

2. Якія сінтаксічныя сродак мастацкай выразнасці выкарыстаны ў вылучаным фрагменце?



**Заданне 4.** Вам добра вядомы загадкі для дзяцей, пабудаваныя на аманіміі слоў. Вось, напрыклад, загадка У. Мазго: *«Аднаго магу запрэгчы, каб падвезці вашы рэчы. А другі ў траве стракоча – у хамут ісці не хоча»*, адгадкамі да якой будуць аманімічныя словы **конік** – *маленкі конь* і **конік** – *насякомае*. А ці залежыць ад значэння склад слова падобных адзінак?

Вызначце, з якіх марфем складаюцца выдзеленыя ў словазлучэннях словы.

*Максімальная колькасць балаў* – 5 (0,5 бала за кожнае правільна разабранае слова).

| Словазлучэнне | Разбор слова па саставе | Словазлучэнне | Разбор слова па саставе |
|---|---|---|---|
| **Узор:** *зялёны* ***конік*** | *конік-□* | *малады* ***конік*** | *кон-ік-□* |
| **паўночны** час | | **паўночны** край | |
| **выраз** для рукавоў | | метафарычны **выраз** | |
| старажытны **хорам** | | спяваць **хорам** | |
| **уплываць** на чалавека | | **уплываць** у бухту | |
| дзедава **байка** | | мяккая **байка** | |

**Заданне 5.** Уявіце, што падчас вашай працы з электронным варыянтам *«Граматычнага слоўніка назоўніка»* адбыўся збой у праграме. Аднавіце граматычныя формы назоўнікаў у слоўнікавых артыкулах.

**Узор:**

**бу́сел** *м.*, бу́сел, *РВ* бу́сла, бу́слу, бу́слам, ________ (?); *мн.* буслы́, *РВ* ________ (?), бусла́м, бусла́мі, бусла́х →

**бу́сел** *м.*, бу́сел, *РВ* бу́сла, бу́слу, бу́слам, **бу́сле**; *мн.* буслы́, *РВ* **бусло́ў**, бусла́м, бусла́мі, бусла́х.

*Максімальная колькасць балаў* –*5* (0,5 бала за кожную правільна запісаную форму).

**перамо́жца** *м.*, пераможца, __________ (?), *ДВМ* __________ (?), пераможцам; *мн.* пераможцы, *РВ* пераможцаў, пераможцам, пераможцамі, пераможцах;

**немаўля́** *н.*, *НВ* немаўля́, *РДМ* немаўля́ці, __________ (?); *мн.* немаўля́ты, *РВ* __________ (?), немаўля́там, немаўля́тамі, немаўля́тах;

**меда́ль** *м.* *НВ* медаль, медаля́, медалю́, медалём, __________ (?); *мн.* *НВ* медалі́, __________ (?), медаля́м, медаля́мі, медаля́х;

**жаўна́** *ж.*, жаўна́, жаўны́, *ДМ* жаўне́, жаўну́, жаўной (-ою); *мн.* (?) __________ (*з ліч. 2, 3, 4* жаўны́), *РВ* __________ (?), жоўнам, жоўнамі, жоўнах;

**ляўша́** *м.* і *ж.* ляўша́, *РДМ* __________ (?), ляўшу́, ляўшой (-ою); *мн.* ляўшы́, *РВ* __________ (?), ляўша́м, ляўша́мі, ляўша́х.

**Заданне 6.** Вызначце значэнні прыназоўнікаў і падбярыце да іх сінонімы.

*Максімальная колькасць балаў – 5* (0,5 бала за правільна вызначанае значэнне і 0,5 бала за прыклад сіноніма).

| Прыназоўнік | Значэнне | Сінонім |
|---|---|---|
| знаходзіцца паблізу лагера | | |
| працаваць ад абеду | | |
| спытацца пра адпачынак | | |
| трава да калена | | |
| нагаварыць са злосці | | |

**Заданне 7.** У радках з верша Р. Барадуліна *«Уцякала зіма ад вясны»* адлюстравана адна з сінтаксічных асаблівасцей беларускай мовы, якая праяўляецца ў пашырэнні дзеяслоўнага кіравання:

*А вясна даганяла зіму;*
*Заяц скочыў у лужу блакіту,*
*Бо на хвост наступіла яму,*
*І пралескі распырскаў, раскідаў.*

Ці валодаюць іншыя часціны мовы здольнасцю кіраваць? Запішыце адпаведныя прыклады, вызначыўшы часцінамоўную прыналежнасць галоўнага ў словазлучэнні слова.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 8.** Абвядзіце кружком нумар правільнага сцвярджэння.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1. **Ода** – урачысты, узнёслы верш, хвалебная песня ў гонар важнай падзеі, з'явы, асобы.
2. **Раманс** – маршавая песня пра баявыя заслугі волатаў і асілкаў.
3. **Навела** – разнавіднасць апавядання пра незвычайныя, выключныя здарэнні ў жыцці чалавека; мае незвычайную развязку.
4. **Фарс** – лёгкая вясёлая камедыя бытавога зместу, з ужываннем знешне камічных прыёмаў..
5. **Ямб** – двухскладовая стапа з націскам на першым складзе.
6. **Амфібрахій** – трохскладовая стапа з націскам на другім складзе.
7. **Анапест** –трохскладовая стапа з націскам на трэцім складзе.
8. **Харэй** – двухскладовая стапа з націскам на другім складзе.
9. **Рыфма** – слова ці радок, якія паўтараюцца пасля кожнай страфы.
10. **Персанаж** – толькі галоўная дзеючая асоба ў мастацкім творы.



11. **Метафара** – перанос уласцівасцей адной з'явы (прадмета) на другую паводле падабенства.
12. **Эпітэт** – мастацкае супастаўленне дзвюх з'яў з мэтай іх характарыстыкі адной праз другую.

**Заданне 9.** Ці добра вы ведаеце жыццё і творчасць Янкі Купалы? Разгадайце крыжаванку.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*




**Па гарызанталі:**

1 – Назва першага зборніка паэзіі Янкі Купалы.
2 – Месца нараджэння паэта.
4 – Горад, у якім паэт скончыў свой зямны шлях.
6 – Пасада, якую ў 1914 – 1915 гг. займаў Янка Купала ў рэдакцыі «Нашай нівы».
9 – Назва другога зборніка паэзіі Янкі Купалы.
11 – Імя бацькі паэта.

**Па вертыкалі:**

3 – Імя героя адной з паэм, на магіле якога быў насыпаны высокі курган – «і горад вырас, як з зямлі».
5 – Прозвішча Лявона – героя адной з п'ес Янкі Купалы.
7 – Свята, на якое нарадзіўся будучы паэт.
8 – Гераіня з аднайменнай паэмы, якая выбірае смерць, чым «піць, гуляці, / Ночкі каратаці».
10 – Назва камедыі, якая стала візітнай карткай Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.
12 – Вёска ў Аршанскім раёне, дзе знаходзілася дача Янкі Купалы.

**Заданне 10.** Прачытайце верш Васіля Жуковіча і адкажыце на пытанні.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

… Над Чорным морам – чаек крык,
І крык той
сэрца разрывае:
Ля сіняй бухты без пары
Сын Беларусі дагарае…

*І кіпарысы не маўчаць,*
*І на сустрэчу песня кліча.*
*І паўстае ў маіх вачах*
Паэта роднага аблічча.